г. Вілейка,
вуліца Чапаева – 65,
тэл. 5-75-47

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Вілейская гімназія № 2”



# ВІЛЕЙСКАЯ ЦАРКВА СВЯТОЙ МАРЫІ ЕГІПЕЦКАЙ

***гістарычны буклет***

падрыхтаваны вучнямі 10 класа
пад кіраўніцтвам М.М. Іваненкі

**2023 год**

У 1863 годзе камер’юнкер Рэдзькін ахвяраваў пэўную суму грошай на будаўніцтва ў межах Беларусі праваслаўнай царквы менавіта ў імя святой Марыі Егіпецкай, па малітвах да якой была дзіўна пазбаўлена ад хваробы яго дачка. З благаславення мітрапаліта Іосіфа Сямашкі месцам будаўніцтва была абрана Вілейка. У маі 1864 года асвячаецца месца для будаўніцтва новай царквы, што існуе і дагэтуль.

Будавалася царква ў даволі хуткія тэрміны па праекце



архітэктара Полазава намаганнямі настаяцеля Свята-Мікалаеўскай царквы Іларыёна Выржыкоўскага. Пяцікупальны храм з цэглы са званіцай у франтальнай частцы быў разлічаны прыкладна на 450 чалавек. Разны іканастас у два з паловай ярусы выкананы разбяром па дрэве Фіндзерам, а іконы напісаны мастаком Васільевым.

22 жніўня 1865 года епіскап Аляксандр асвяціў храм і прызначыў яго настаяцелем протаіерэя Іларыёна Выржыкоўскага. З гэтага часу Свята-Марыінская царква стала галоўным храмам Вілейкі.

***Храналагічны спіс настаяцеляў***
***Свята-Марыінскай царквы з часу яе пабудовы***

1865-1874 - протаіерэй Іларыён Выржыкоўскі
1874-1876 - іерэй Нікадзім Бабулевіч
1877-1889 - протаіерэй Іосіф Парчэўскі
1889-1898 - іерэй Іакаў Асіповіч
1898-1899 - іерэй Аляксандр Нядзьвецкі
1899-1901 - протаіерэй Мікалай Валкоўскі
1901 - іерэй Стэфан Дружылоўскі
1901 - іерэй Арсеній Раслякоў
1901-1905 - іерэй Понцій Рупышаў
1905-1914 - іерэй Уладзімір Жданаў
1914-1921 - іерэй Віктар Краскоўскі
1921-1929 - протаіерэй Павел Аноп
1929-1934 - протаіерэй Мікалай Валкоўскі
1934-1951 - протаіерэй Леў Бяляўскі
1951-1973 - протаіерэй Аляксандр Мароз
1973-1985 - протаіерэй Яўгеній Маленціновіч
1985-2014 - протаіерэй Сіміяон Мацюх
2014-2021 – іераманах Аляксандр Шмырко
З 2021 па сёняшні час – протаіерэй Вячаслаў Вабішчэвіч

Зараз у Вілейскай Царкве Святой Прападобнай Марыі Егіпецкай зберагаецца мноства старадаўніх ікон. Сярод іх – ікона Божай Маці “Уладзімірская” ў спецыяльнымківоце з надпісам 1863 года пра фундатара, які ахвяраваў свае сродкі на будаўніцтва храма; ікона Святых Віленскіх мучанікаў Антонія, Іаана і Еўстафія; ікона “Маленне аб Чашы”, размешчаная ў алтары, напісана на палатне даволі вялікіх памераў, рэстаўрыравана мастаком Вольгай Рыбінай ў 2002 годзе.

З 7 красавіка 1999 года па благаславенні Мітрапаліта Філарэта пры храме дзейнічае сястрыцтва ў імя Прападобнай Марыі Егіпецкай, якое ўзначальвае старэйшая сястра Алена Уладзіміраўна Касовіч. У сястрыцтве працуе 18 сясцёр рознага ўзросту, адукацыі і сацыяльнага статусу. Яны арганізуюць паломніцкія паездкі па святых месцах, вядуць летапіс храма, даглядаюць хворых на даму, чытаюць Псалтыр па памерлых.

Працуе прыхадская бібліятэка.